Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.
№ 61 (130)
ПЯТНІЦА
15
САКАВІКА
1940 г.

Цана 10 капеек

СЁННЯ Ў НУМАРЫ.

УЗОРНА ПАДРЫХТУЕМСЯ ДА ПЕРШАЙ СОВЕЦКАЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ

Набліжаецца першая совецкая вясна ў вызваленых вёсках заходніх абласцей Беларусі. Вясна ў мінулым выклікала многа трывог у асноўнай масе сялян. Беззямельны і малазямельны селянін сустракаў вясну без перспектыў на паляпшэнне свайго жыцця. Прадстаяла цяжкая зморваючая *праца на кулакоў і памешчыкаў, прадстаяла праца* на чужой зямлі, на абагачэнне чужых народу людзей.

Прайшло менш паўгода, і сялянскія масы зажылі новым, радасным і свабодным жыццём. Дзесяткі тысяч беззямельных і малазямельных сялян атрымалі зямлю ад совецкай улады. Навечна выгнаны памешчыкі, асаднікі і ўсялякая іншая нечысць. *Сяляне* ўпершыню ў сваім жыцці будуць працаваць на сваёй зямлі. Перад сялянскімі масамі адкрыліся радасныя перспектывы. Гэта вясна будзе сапраўды першай вясной чалавецтва ў жыцці мільёнаў працоўных вёскі заходніх абласцей.

Совецкая ўлада не толькі дала сялянам зямлю. Совецкая ўлада клапоціцца аб тым, каб сяляне атрымалі на гэтай зямлі куды большыя ўраджаі, чым атрымлівае памешчык, каб уся зямля была поўнасцю і ў тэрмін засеяна ачышчаным насеннем. Совецкая ўлада дапамагае сялянам аграномічнымі сіламі, каб укараніць навейшыя метады апрацоўкі зямлі, багатую практыку калгаснага сялянства, якое атрымлівае нябачаныя дасюль вялікія ўраджаі. Совецкая ўлада арганізуе ў вызваленых абласцях машынна-трактарныя станцыі, рыхтуе кадры трактарыстаў. Арганізаваны зернаачышчальныя абозы. Прымаюцца меры для арганізацыі вялікай сеткі кузняў для рамонту сельгасінвентара і т. д.

Ёсць усе магчымасці для таго, каб першую совецкую вясну правесці арганізавана, пабольшавіцку. Залогам гэтага з'яўляецца вялікая палітычная актыўнасць сялянскіх мас, іх бязмежная любоў да партыі і совецкай улады, да свайго вызваліцеля вялікага Сталіна. Гэта відаць хоць-бы з таго, што тысячы сялян падаюць заявы з просьбай дазволіць ім арганізаваць сельскагаспадарчыя арцелі. У многіх раёнах нашай вобласці сяляне сустракаюць першую совецкую вясну калектыўнай працай.

Але было-б недаравальна для партыйных і совецкіх работнікаў разважаць так, што веснавая сяўба можа быць паспяхова праведзена без належнага кіраўніцтва. Нельга забываць, што кулаччо там-сям пачынае ўзнімаць галаву. Яно пускае ўсялякія правакацыйныя чуткі і імкнецца запалохаць адсталую частку сялян, угаварваючы іх не засяваць атрыманую ад памешчыкаў зямлю. І чым бліжэй вясеннія палявыя работы, тым вастрэй разгарыцца класавая барацьба ў вёсцы. Доўг партыйных і совецкіх арганізацый — нястомна выхоўваць сялянскія масы ў духу рэвалюцыйнай пільнасці, арганізоўваць іх на выкрыццё кулацкіх вылазак.

Вялікая палітычная работа, якая зараз праводзіцца ў вёсцы, у сувязі з надыходзячымі выбарамі ў Вярхоўныя Советы, не павінна быць аслаблена, а намнога разоў узмоцнена і пасля выбараў. Разам з гэтым ад раённых партыйных, совецкіх і зямельных органаў патрабуецца практычная крапатлівая чарнавая работа па забеспячэнню паспяховага правядзення веснавой сяўбы. Нельга цярпець таго, *што да гэтага часу яшчэ* не ва ўсіх былых маёнтках закончан абмалот. Па Бельскаму раёну, напрыклад, прастойваюць лакамабілі з прычыны адсутнасці... дроў. Бельскі раён, здаецца, не ў стэпе, а ў багатай лясной мясцовасці размешчан. Няўжо цяжка загатовіць дровы для лакамабіляў? У гэтым-жа раёне яшчэ не ачышчана і палова насеннага матэрыялу.

Не лепш справы і ў Беластоцкім раёне. Тут існуе вялікая магічная вера ў сілу паперкі. Рашылі і запісалі—арганізаваць зернаачышчальныя абозы,—а як яны працуюць—райзакават і разумення не мае. Можна прывесці аналагічныя факты і па іншых раёнах. Гэта гаворыць аб тым, *што ў падрыхтоўцы да сяўбы яшчэ далёка* не ўсё зроблена.

Сёння ў Беластоку адкрываецца першая абласная нарада сялян. Нарада павінна прайсці ў выключна дзелавой абстаноўцы. Трэба да канца выявіць усе недахопы, якія мы маем у падрыхтоўцы да сяўбы, і мабілізаваць ініцыятыву сялян на перамаганне гэтых недахопаў. Першая совецкая вясна павінна быць праведзена ўзорна. На вызваленай зямлі павінен быць заваёван багаты ўраджай!

——«о»——

Дэлегацыя калгаснікаў усходніх абласцей БССР

Для ўдзелу ў нарадзе сялян Беластоцкай вобласці прыбыла дэлегацыя з калгасаў усходніх абласцей Беларускай ССР. Сярод прыбыўшых — старшыня калгаса „Чырвоны агароднік“, Мінскага раёна, ордэнаносец тав. Трушкевіч П. Т.; старшыня калгаса ім. БАВА, Любаньскага раёна, тав. Анісімаў П. Д.; старшыня калгаса „Большэвік“, Барысаўскага раёна, тав. Шарамека М. К.; старшыня калгаса „1 мая“, Слуцкага раёна, тав. Стругач С. Ш. і загадчык свінатаварнай фермы гэтага калгаса тав. Вераб'ёў В. К.

На нараду прыбылі таксама навуковы работнік беларускай плодаагароднай станцыі тав. Сюбарава Э. П. і тав. Жукаў С. С, загадчык сельскагаспадарчым аддзелам Мінскага абкома КП(б)Б.


У К А З
Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
Аб скліканні шостай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР

Склікаць 29 сакавіка г. г. ў горадзе Маскве Шостую Сесію Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль
14 сакавіка 1940 г.



Тав. КРУК СЦЯПАН ЛЕОНЦЬЕВІЧ
кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па 378 выбарчай акрузе.

Сустрэча кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР тав. Ф. С. Пестрака з выбаршчыкамі

Гродна. (Па тэлефону). Зал Верталіскай школы перапоўнен. Звыш 400 сялян сабраліся на перадвыбарчы сход для сустрэчы са сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР тав. Філіпам Сямёнавічам *Пестраком.*

Слова прадастаўляецца тав. Пестраку.

— Дазвольце мне, — гаворыць ён, — сваё першае слова ўдзячнасці выказаць таму, хто *даў нам права* выбіраць і быць выбраным, хто даў нам права *жыць пад праменнямі* самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі — дарагому і любімаму Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну.

Уважліва слухаюць выбаршчыкі свайго кандыдата. Турмы, голад былі пастаяннымі спадарожнікамі тав. Пестрака і яго сям'і. Але нішто не зламала яго волі ў барацьбе за свабоду і шчасце народа.

— Мне аказана вялікая часць, — гаворыць далей тав. Пестрак. — Народ вылучыў мяне кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР. Я аддам ўсё сваё жыццё за справу народа, за справу вялікай партыі Леніна—Сталіна.

Затым слова папрасіў селянін Павел Апалонка.

— Наш кандыдат тав. Пестрак, — гаворыць тав. Апалонка, — з'яўляецца сапраўдным прадстаўніком народа. Ён усё сваё маладое жыццё прысвяціў рэволюцыйнай барацьбе за вызваленне працоўных мас з-пад ярма польскіх памешчыкаў і капіталістаў. Я заклікаю ўсіх выбаршчыкаў у дзень выбараў аддаць свае галасы за дастойнага сына нашай соцыялістычнай радзімы тав. Пестрака.

Адзін за другім выступалі прамоўцы. Усе яны заяўлялі, што ў дзень выбараў 24 сакавіка выбаршчыкі Верталіскага выбарчага ўчастка прадэманструюць сваю любоў і адданасць большэвіцкай партыі, Совецкаму ўраду, і ўсе, як адзін, пойдуць да выбарчых урнаў і аддадуць свае галасы за кандыдатаў непераможнага сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

П. Маўрын.

НА 97 ВЫБАРЧЫМ УЧАСТКУ

Святочна ўпрыгожаны фасад памяшкання выбарчага ўчастка прыцягвае ўсеагульную ўвагу. Тут на розных мовах развешаны лозунгі і плакаты па выбарах у Вярхоўныя Советы, партрэты кіраўнікоў партыі і ўрада. Пакой абсталяван мэбляй. У вольны час маладыя выбаршчыкі тут іграюць на піяніна і спяваюць любімыя народныя і рэволюцыйныя песні.

Асаблівую цікавасць праяўляюць выбаршчыкі да абароннага кутка. Тут яны знаёмяцца з Чырвонай Арміяй і яе героямі. Па жаданню выбаршчыкаў днямі распачаў работу гурток па вывучэнню вайсковай справы.

Выбаршчыкі наведваюць памяшканне выбарчага ўчастка з ранку да позняга вечара. Агітатар т. Міхайленка старанай работай заваяваў сярод выбаршчыкаў аўтарытэт. У яго блакноце запісаны ўсе праведзеныя мерапрыемствы. Тут-жа запісаны адрасы дамоў, дзе працуюць 32 гурткі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах.

Працоўныя аднадушна вылучылі сваімі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР таварышаў Кавалёва, Турлейскага і Тупіцына. Цяпер выбаршчыкі вывучаюць біяграфіі сваіх кандыдатаў і рыхтуюцца ў дзень выбараў — 24 сакавіка — аддаць за іх свае галасы.

Г. Вакуленка.

НА ПАСЯДЖЭННІ СОЎНАРКОМА

Днямі, пад старшынствам тав. Кісялёва адбылося чарговае пасяджэнне Совета Народных Камісараў БССР. Было разгледжана пытанне аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы ў заходніх абласцях Беларускай ССР.

У пастанове па гэтаму пытанню Соўнарком абавязаў старшынь аблвыканкомаў заходніх абласцей правесці нарады старшынь райвыканкомаў і загадчыкаў Райза па пытанню падрыхтоўкі да сяўбы. *Для аказання* аблвыканкомам практычнай дапамогі ў падрыхтоўцы да сяўбы Наркамзему БССР прапанавана паслаць у заходнія вобласці адказных работнікаў. Белкаапсаюзу *дадзена ўказанне ўзмацніць* адгрузку для заходніх абласцей матэрыялаў, неабходных для рамонту сельскагаспадарчага інвентара. Рамонт інвентара павінен быць закончан не пазней 1 красавіка. Для гэтага аблвыканкомы і райвыканкомы павінны арганізаваць работу існуючых кузняў, а таксама адкрыць рад новых.

Соўнарком абавязаў Наркамзем БССР неадкладна наладзіць у заходніх абласцях работу міжраённых кантрольна - насенных лабараторый, распрацаваць практычныя мерапрыемствы па аграпрапагандзе і даць раёнам указанне аб парадку планіравання пасеваў.

Упраўленню Народнага гаспадарчага ўчоту дадзена ўказанне ўстанавіць сумесна з Наркамземам дзяржаўную справаздачнасць па асноўных сельскагаспадарчых работах у заходніх абласцях.

Разгледжана таксама пытанне аб рабоце школ заходніх абласцей БССР.

У рэзультаце рэарганізацыі школ у адпаведнасці з прынцыпамі ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі ў заходніх абласцях адкрыта і працуе 4501 беларуская школа, 173 — рускіх, 49 — украінскіх, 186 — яўрэйскіх, 64 — літоўскіх і 966 — *польскіх. Праведзена вялікая работа па падрыхтоўцы* і перападрыхтоўцы настаўнікаў, па забеспячэнню школ праграмамі, падручнікамі, па ўкамплектаванню кіруючымі работнікамі аддзелаў народнай асветы. Праведзеная рэарганізацыя школ на совецкую сістэму навучання знайшла поўнае падтрыманне з боку працоўных мас і народных настаўнікаў.

Аднак, у правядзенні рэарганізацыі школ ёсць яшчэ рад істотных недахопаў. У радзе выпадкаў яна была пушчана на самацёк. У рэзультаце гэтага, напрыклад, у асобных раёнах Брэсцкай вобласці не былі своечасова адкрыты ўкраінскія школы. У некаторых месцах адкрыты карлікавыя школы, што прыводзіць да няправільнага скарыстання педагагічных кадраў і лішніх фінансавых затрат. Наркамат Асветы яшчэ не забяспечыў праграмамі і падручнікамі яўрэйскія, літоўскія і польскія школы. У радзе школ выкладанне вядзецца па старых падручніках. Нездавальняючым застаецца яшчэ і забеспячэнне пачатковых школ заходніх абласцей педагагічнымі кадрамі. Рад школ з-за адсутнасці педкадраў не могуць весці нармальнай работы. Недапушчальным з'яўляецца тое, што школы заходніх абласцей не забяспечаны ў дастатковай ступені сшыткамі і другімі пісьмовымі прыладамі.

Совет Народных Камісараў БССР пастанавіў перагледзіць да 15 сакавіка сетку рэарганізаваных школ з мэтай поўнага ажыццяўлення ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучання ў сельскіх мясцовасцях і 7-гадовага навучання ў гарадах. Белдзяржвыдавецтву прапанавана ўскорыць выпуск падручнікаў і метадычнай літаратуры для заходніх абласцей БССР.

Наркому асветы тав. Ураловай прапанавана ў бліжэйшы час укамплектаваць апараты раённых аддзелаў народнай асветы інспектарамі-метадыстамі за лік лепшых педагогаў. У мэтах забеспячэння школ заходніх абласцей педагагічнымі кадрамі Наркамасветы абавязан падрыхтаваць праз курсавыя мерапрыемствы 3 тысячы настаўнікаў. Ва ўсіх раёнах павінны быць арганізаваны семінары па павышэнню ідэйна-тэарэтычнага і педагагічнага ўзроўню настаўнікаў. Для павышэння дзелавой кваліфікацыі настаўнікаў заходніх абласцей Наркамату народнай асветы БССР прапанавана распрацаваць рад мерапрыемстваў гурткавой вучобы настаўнікаў і работы ў педкабінетах.

Соўнарком абавязаў Белкаапсаюз, Аблвыканкомы і Наркамат Гандлю ў месячны тэрмін адкрыць ва ўсіх раённых цэнтрах заходніх абласцей магазіны культтавараў па продажу падручнікаў, вучэбна-наглядных дапаможнікаў і пісьмовых прылад, арганізаваць у кустпромарцелях выраб школьнай мэблі, завезці праз існуючую гандлёвую сетку ў сельскія мясцовасці дзіцячы абутак і вопратку, арганізаваўшы продаж іх па заяўках школ.

Аблвыканкомам прапанавана неадкладна ліквідаваць запазычанасць па зарплаце настаўнікам і ў далейшым не дапускаць падобнай практыкі. Фінансаванне ўсіх школ заходніх абласцей пераведзена на бюджэт райвыканкомаў.

На гэтым-ж пасяджэнні былі разгледжаны пытанні аб ходзе падрыхтоўкі трактарыстаў і масавых калгасных кадраў, аб арганізацыі дзяржаўнага і каапэратыўнага гандлю ў заходніх абласцях БССР і інш. Па ўсіх разгледжаных пытаннях прыняты адпаведныя рашэнні.

(БЕЛТА).

IV З'ЕЗД КП(б) КІРГІЗІІ

Фрунзе, 13 сакавіка. (ТАСС). Сёння адкрыўся IV з'езд КП(б) Кіргізіі. На з'езд прыбыла 273 дэлегаты з рашаючым голасам і 75 — з дарадчым. Кароткую ўступную прамову зрабіў сакратар ЦК КП(б) Кіргізіі тав. Вагаў.

З вялікім уздымам у пачотны прэзідыум з'езда выбрана Палітбюро ЦК ВКП(б). Пачотным старшынёй з'езда аднадушна выбран таварыш Сталін.

Пад захапляючыя авацыі ўсяго зала прымаецца прывітанне таварышу Сталіну.

VI З'ЕЗД КП(б) ТАДЖЫКІСТАНА

Сталінабад, 13 сакавіка. (ТАСС). Сёння адкрыўся VI з'езд КП(б) Таджыкістана. Гучнымі апладысментамі сустрэў з'езд паведамленне аб заключэнні мірнага дагавора паміж СССР і Фінляндскай Рэспублікай.

На з'езд прыбыла 216 дэлегатаў з рашаючым голасам і 66 — з дарадчым.

Пад бурныя авацыі ў пачотны прэзідыум з'езда выбіраецца Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным. Пачотным старшынёй з'езда выбіраецца таварыш Сталін.

ДОМ - МУЗЕЙ А. М. ГОРКАГА

Казань. Адбылося адкрыццё Дома-музея А. М. Горкага. Дом змяшчаецца ў будынку, дзе ў васьмідзесятых годах мінулага стагоддзя была булачная Дзеранкова. Тут падручным пекара працаваў Алексей Максімавіч.

У музеі захоўваецца мадэль парахода «Добрый», на якім Алексей Максімавіч служыў пасуднікам.

МІР ТАРЖАСТВУЕ НА ГРАНІЦАХ СОВЕЦКАГА САЮЗА

БУДЗЕМ ЯШЧЭ БОЛЬШ УМАЦОЎВАЦЬ АБАРОННУЮ МАГУТНАСЦЬ НАШАЙ РАДЗІМЫ!

ТАРЖАСТВО СТАЛІНСКАЙ ПАЛІТЫКІ МІРУ

Ленінград, 13 сакавіка. (ТАСС). Многатысячны калектыў Кіраўскага завода з вялікім уздымам сустрэў вестку аб мірным дагаворы паміж СССР і Фінляндскай Рэспублікай.

Ужо з раніцы гэта вестка перадавалася з вуснаў у вусны, ад варштата да варштата. Днём у цэхі і аддзелы, у чырвоныя куткі — прышлі токары, слесары, кавалі, сталявары, турбіншчыкі і трактаршчыкі.

Яркую прамову аб згуртаванасці і магутнасці народаў многанацыянальнай совецкай краіны сказаў на мітынгу ў турбінным цэху памочнік начальніка стэнда тав. Шальман.

— Гераічныя сыны совецкага народа, — сказаў тав. Шальман, — у кароткі тэрмін разграмілі ўмацаванні, якія лічыліся непрыступнымі. Цяпер наш родны горад у безапаснасці. Паўночна-заходняя граніца Совецкага Саюза на моцным замку. Увесь народ адабрае мірны дагавор Совецкага Саюза з Фінляндыяй.

Выступіўшы затым ордананосец тав. Пілатаў заявіў:

— У гэтым месяцы мы слаўна папрацавалі і ў тыле. Мы будзем і надалей мацаваць нашу Чырвоную Армію, наш Чырвоны Флот і працаваць на дабро радзімы таксама беззаветна, як змагаліся на фронце слаўныя воіны краіны соцыялізма.

На мітынгах, дзе прысутнічала каля 15 тыс. чалавек, кіраўцы аднадушна прынялі рэзалюцыю. У ёй гаворыцца:

«З велізарным натхненнем сустрэлі мы радасную вестку аб заключэнні міру з Фінляндыяй. Совецкі Саюз дасягнуў сваёй мэты. Дзякуючы мудрай сталінскай палітыцы ліквідаван небяспечны ачаг вайны на паўночна-заходняй граніцы, забяспечана безапаснасць нашага роднага горада Леніна, Мурманска і Мурманскай чыгункі. Дагавор, заключаны з Фінляндскай Рэспублікай, яшчэ раз даказвае нерушымасць мірнай палітыкі совецкага ўрада, яшчэ раз дэманструючы сілу і магутнасць соцыялістычнай радзімы, магутнасць і непераможнасць нашай любімай Чырвонай Арміі.

Падзеі ў Фінляндыі яшчэ раз паказалі вялікую згуртаванасць совецкага народа і магутнасць яго арміі.

Мы, кіраўцы, гардзімся тым, што самаадданай працай, паспяховым выкананнем абаронных заказаў дапамаглі нашай Чырвонай Арміі забяспечыць перамогі, якія знайшлі сваё замацаванне ў мірным дагаворы.

Новую, слаўную перамогу сталінскай палітыкі міру горача вітае ўвесь совецкі народ, усё перадавое чалавецтва, якое змагаецца за спыненне імперыялістычнай вайны. З гэтага часу на ўсіх граніцах нашай вялікай бацькаўшчыны таржаствуе мір. За гэты мір Совецкі Саюз зможа пастаяць. Парукай таму — несакрушальная адзінства совецкага народа, яго згуртаванне вакол партыі Леніна—Сталіна.

Няхай жыве наш Совецкі ўрад!

Няхай жыве глава Совецкага ўрада Вячаслаў Міхайлавіч Молатаў!

Няхай жыве наша непераможная Чырвоная Армія і яе кіраўнік маршал Совецкага Саюза Клімент Ефрэмавіч Варашылаў!

Няхай жыве геній чалавецтва вялікі Сталін!»

Мы гардзімся нашай Чырвонай Арміяй

Растоў-на-Дану, 13 сакавіка. (ТАСС). Сёння ў буйнейшым цэху ордананоснага паравозавагонарамонтнага завода імені Леніна звыш 2500 рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых сабралася на мітынг, прысвечаны заключэнню мірнага дагавора паміж СССР і Фінляндыяй. Слова атрымоўвае інжынер-планавік тав. Заржэўскі.

Розныя падбухторшчыкі вайны,—гаворыць ён,—усімі сіламі імкнуцца расшырыць другую імперыялістычную бойню на ўсю Еўропу. Але Чырвоная Армія расстроіла іх планы. Наперакор намаганням падпальшчыкаў вайны Совецкі Саюз забяспечыў безапаснасць сваіх паўночна-заходніх граніц. Мірны дагавор з Фінляндскай Рэспублікай яшчэ раз паказвае ўсяму чалавецтву, што СССР паслядоўна праводзіць сталінскую палітыку міру і паважае правы малых дзяржаў.

На трыбуну паднімаецца стары кацельшчык ордананосец тав. Куліненка. Ён гаворыць:

— Мы гардзімся нашай Чырвонай Арміяй, якая разграміла цвярдыні лініі Манергейма, якую буржуазія лічыла непрыступнай. Хай запамятаюць імперыялісты, што няма такіх крэпасцей, якіх Чырвоная Армія не зможа ўзяць. Гэта яна дастаткова наглядна прадэманстрывала на Карэльскім перашыйку.

У аднагалосна прынятай рэзалюцыі ўдзельнікі мітынга заяўляюць:

«Рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя ордэна Чырвонага Сцяга паравозавагонарамонтнага завода імені Леніна горача адабраюць мірную палітыку Совецкага ўрада. Магутная Чырвоная Армія змагла адстаяць недатыкальнасць граніц нашай любімай радзімы. Хай памятаюць ворагі, што Совецкі Саюз заўсёды будзе адказваць на ўдар падпальшчыкаў вайны двайным ударам.

Мы, чыгуначнікі, яшчэ больш будзем мацаваць соцыялістычны транспарт, мацаваць магутнасць абароны радзімы перавыкананнем сваіх вытворчых планаў.

Няхай жыве сталінская палітыка міру!».

Прыкладзем усе сілы для перавыканання вытворчых заданняў

Магнітагорск, 13 сакавіка. (ТАСС). Вестку аб заключэнні мірнага дагавора паміж СССР і Фінляндскай Рэспублікай металургі Магнітагорска сустрэлі з глыбокім задавальненнем.

— Абараняючы кроўныя інтарэсы соцыялістычнай радзімы, доблесныя байцы, камандзіры і палітработнікі слаўных баявых часцей Ленінградскай ваеннай акругі паказалі нябачаны гераізм,—сказаў у сваім выступленні на мітынгу доменшчыкаў электрык тав. Зайка.— Сваімі подзвігамі яны яшчэ раз праславілі на ўвесь свет сілу і магутнасць непераможнай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

У рэзалюцыях, прынятых на мітынгах, мартэнаўцы, пракатчыкі, доменшчыкі заяўляюць:

— Мы выражаем глыбокую падзяку нашаму ўраду і асабліва таварышу Сталіну за мудрую палітыку міру. Прыкладзем усе нашы сілы для перавыканання вытворчага задання. Дадзім столькі метала, колькі патрабуе краіна для далейшага развіцця народнай гаспадаркі, для яшчэ большага ўмацавання абароннай магутнасці нашай дзяржавы.

Няхай жыве мудрая сталінская палітыка міру!

Няхай жыве вялікі правадыр працоўных—наш родны, любімы таварыш Сталін!

Планы Англіі і Францыі праваліліся

З найвялікшай радасцю сустрэў калектыў 3-га тэкстыльнага камбіната вестку аб заключэнні мірнага дагавора паміж СССР і Фінляндскай Рэспублікай. 400 чалавек рабочых і работніц, інжынераў і тэхнікаў сабраліся ўчора на мітынг, каб выказаць сваё гарачае адабрэнне мудрай знешняй палітыкі Совецкага ўрада.

Мітынг адкрыў старшыня фабкома тав. Кучынскі. З натхнёнай прамовай выступіў ткач тав. Міхайлоўскі.

У мэтах забеспячэння безапаснасці нашай краіны, асабліва гор. Ленінграда, Совецкі ўрад прапанаваў Фінляндыі ўзаемна выгадныя ўмовы. Але падбухтораная англа-французскімі падпальшчыкамі вайны Фінляндыя адхіліла нашы прапановы. Наша гераічная Чырвоная Армія разбіла ўмацаванні Манергейма і яшчэ раз паказала сваю магутнасць, яшчэ раз падцвердзіла сталінскія словы аб тым, што няма такіх крэпасцей, якіх не змаглі-б узяць большэвікі.

Планы Англіі і Францыі ўцягнуць Совецкі Саюз у вайну праваліліся і на гэты раз.

Апошнія словы тав. Міхайлоўскага пакрываюцца дружнымі доўга не змаўкаючымі апладысментамі.

Затым слова атрымлівае ткач тав. Рынкевіч. Ён дзякуе Чырвонай Арміі, партыі і таварышу Сталіну за вызваленне, за мірнае шчаслівае жыццё.

У час выбараў у Вярхоўныя Советы — 24 сакавіка — мы прадэманструем сваю згуртаванасць вакол партыі Леніна—Сталіна, будзем дружна галасаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

У аднадушна прынятай рэзалюцыі рабочыя пішуць:

„Мы горача адабраем знешнюю палітыку Совецкага ўрада і вітаем мірны дагавор паміж СССР і Фінляндыяй. Гэты дагавор яшчэ раз паказвае несакрушальную магутнасць нашай Чырвонай Арміі і мудрасць сталінскай знешняй палітыкі.

Мы абавязуемся падвоіць сваю энергію, яшчэ лепш працаваць на карысць нашай радзімы"

А. Тэляс.

МУДРАЯ ПАЛІТЫКА МІРУ

У тры гадзіны дня 13 сакавіка плошча Калініна горада Васількова запоўнілася народам. 3.000 чалавек сабраліся на мітынг, прысвечаны заключэнню мірнага дагавора паміж Совецкім Саюзам і Фінляндскай Рэспублікай.

На мітынгу з гарачай прамовай выступіў рабочы тэкстыльнага камбіната тав. Бібер:

— Фінская белагвардзейшчына, якую абманулі англа-французскія падпальшчыкі сусветнай крывавай бойні, праілічылася. Доблесная Чырвоная Армія нанесла белафінам знішчальны ўдар. Я ад усяго шчырага сэрца вітаю нашу доблесную Чырвоную Армію, якая папярэдзіла ачаг вайны, вітаю наш урад і яго вялікую і мудрую палітыку міру.

Набліжаецца дзень выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР,— і мы, працоўныя заходніх абласцей БССР, стопроцантным удзелам у выбарах і галасаванні за кандыдатаў непераможнага блока комуністаў і беспартыйных прадэманструем сваю любоў і адданасць радзіме, Совецкаму ўраду і роднаму Сталіну, — гаворыць рабочы тэкстыльнага камбіната тав. Левін.

У аднадушна прынятай рэзалюцыі ўдзельнікі мітынга запісалі:

„Мы гардзімся мудрай палітыкай нашага Совецкага ўрада, магутнасцю нашай доблеснай Чырвонай Арміі і ўсяго 183 мільённага народа, які яшчэ раз даказаў усяму свету, што палітыка англа-французскіх імперыялістаў заграбаць жар чужымі рукамі і ўцягнуць краіну соцыялізма ў крывавую бойню пацярпела крах.

Чэсць і слава байцам, камандзірам і палітработнікам Ленінградскай акругі, якія ў гераічнай барацьбе ліквідавалі ачаг вайны супроць СССР і ўпершыню ў гісторыі войнаў за кароткі час знішчылі ўмацаванні, якія пагражалі гораду Леніна.

Няхай жыве мірная палітыка нашага ўрада!

Няхай жыве мудры, любімы друг і настаўнік наш родны Сталін!

Д. Казлоў.

ГОРА БУДЗЕ ТАМУ, ХТО ПАСЯГНЕ НА НАШ МІР

У падраздзяленні, якім камандуе тав. Ігнацьеў, адбыўся многалюдны мітынг байцоў, камандзіраў, прысвечаны заключэнню мірнага дагавора паміж СССР і Фінляндыяй.

На трыбуне намеснік палітрука тав. Фацееў.

— Мірны дагавор паміж СССР і Фінляндскай Рэспублікай, — гаварыць ён, — з'яўляецца новым доказам цвёрдай мірнай палітыкі СССР. Яшчэ ў 1920 годзе устанавіліся прыяцельскі ўзаемаадносіны паміж народамі Фінляндыі і краіны Советаў. Працоўныя Фінляндыі імкнуліся ўмацаваць і яшчэ далей развіць гэтыя адносіны, але кучка крывавых катаў — капіталістаў, азлобленых на Совецкі Саюз, аскаліўшы воўчыя зубы, паспрабавала парушыць нашы граніцы і, безумоўна, атрымала за гэта па заслугах.

Мы разам з усім народам вітаем мудрую палітыку міру нашага ўрада. Гэты дагавор яшчэ лепш умацуе мір ва ўсім свеце.

Выдатнік баявой і палітычнай падрыхтоўкі чырвонаармеец тав. Курачыцаў у сваім выступленні гаворыць:

— Мы віталі рашэнне партыі і ўрада аб спыненні ваенных дзеянняў паміж СССР і Фінляндскай Рэспублікай. Але небяспека новага нападу на Совецкі Саюз з боку агрэсараў яшчэ не мінавала. Таму патрэбна ўпорна працаваць над павышэннем баявой магутнасці і сілы Чырвонай Арміі. Я вучуся выдатна па ўсіх дысцыплінах. Абавязуюся быць выдатнікам і надалей. Да гэтага заклікаю ўсіх астатніх таварышаў, каб у любую мінуту стаць на абарону любімай соцыялістычнай радзімы.

У аднагалосна прынятай рэзалюцыі мітынга гаворыцца:

„Аднадушна адабраем і вітаем паслядоўную і цвёрдую палітыку міру, якую праводзіць наш ўрад і вялікі Сталін.

Гора будзе тым, хто асмеліцца парушыць наша мірнае жыццё. Любы агрэсар атрымае сакрушальны ўдар ад нашай Чырвонай Арміі і будзе знішчан на яго-ж тэрыторыі.

Няхай жыве мірная палітыка СССР!

Няхай жыве надзейная апора міру — Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот!

Няхай жыве глава Совецкага ўрада і нарком замежных спраў таварыш Молатаў!

Няхай жыве вялікі правадыр і настаўнік таварыш Сталін!".

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР ПА 380 ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ

Ніна Віктараўна Смаржко

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)



Сход доўга шумеў радаснымі апладысментамі ў адказ на прапанову вылучыць Ніну Віктараўну Смаржко кандыдатам у дэпутаты соцыялістычнага парламента Совецкай Беларусі.

Седзячы ў прэзідыуме схода, Ніна Віктараўна хвалявалася, крыху чырванела. Старшынстваючы прадаставіў ёй слова. Гарачай, усхваляванай была яе прамова.

Пасля яе яшчэ выступалі прамоўцы. Усе яны гаварылі, што Ніна Віктараўна — гэта верная дачка працоўнага народа, да канца адданая рабочаму класу, сваёй радзіме, вялікай партыі Леніна — Сталіна.

Ніне Віктараўне 24 годы. Яна нарадзілася ў 1915 годзе ў сям'і рабочага цэментнага завода „Рось". Бязрадаснымі і цяжкімі былі дзіцячыя годы Ніны. Ёй хацелася вучыцца, толькі дзверы ў школе для яе, дачкі рабочага, былі зачынены. Вучыліся сынкі фабрыкантаў, памешчыкаў, капіталістаў. З вялікімі цяжкасцямі ёй удалося скончыць чатыры класы вясковай школы. Далей вучыцца не прышлося: не было сродкаў.

11-гадовай дзяўчынкай Ніна пайшла ў людзі зарабляць на сябе хлеб. За 12 кілометраў хадзіла на работу. Цяжка прыходзілася працаваць. А плацілі пан 50 грошай у дзень.

Ніна рашыла паступіць на завод. Але не так лёгка. Дзесяткі разоў яна хадзіла да заводчыка з просьбай прыняць яе на работу. Нарэшце прынялі. Цяжкая, катаржная праца, а заработак такі, што не хапала на хлеб.

Жыццёвы шлях Ніны Смаржко — гэта шлях дзесяткаў соцень юнакоў і дзяўчат у былой панскай Польшчы. Беспрацоўе, галеча, голад, усё гэта цярпела і перажыла Ніна Віктараўна Смаржко.

Рабочыя атрымалі радасную вестку аб прыходзе Чырвонай Арміі. Радасна рыхтавалася Ніна Смаржко разам з рабочымі да сустрэчы сваёй вызваліцельніцы.

З прыходам Чырвонай Арміі перамянілася жыццё Ніны, як і ўсіх працоўных Заходняй Беларусі. Сям'я Ніны, якая раней тулілася ў цёмнай канурцы, атрымала чыстую, утульную кватэру.

Ніна Віктараўна з прагнасцю ўзялася чытаць совецкія кнігі і газеты, дзялілася з рабочымі прачытаным. Расказвала моладзі завода аб жыцці і рабоце моладзі ў Совецкім Саюзе. Усе ўважліва слухалі яе простыя расказы. Ніна Віктараўна становіцца перадавой актывісткай на заводзе. Яе, як актыўную грамадзіцу, пасылаюць на месячныя курсы совецкага актыва. Узбагаціўшыся ведамі, яна стала яшчэ актыўней удзельнічаць у грамадскай рабоце завода.

Ніну прынялі ў члены ленінска-сталінскага комсамола. Гэты дзень асабліва быў радасным для яе. На заводзе створана комсамольская арганізацыя. Ніну выбіраюць сакратаром. Комсамольская арганізацыя пачала расці за лік перадавой моладзі. Тры браты Ніны: Віктар, Міхаіл і Нікалай таксама ўступілі ў комсамол. У рады комсамола прынята пяць дзяўчат—перадавікоў вытворчасці.

Комсамольская арганізацыя праводзіць вялікую работу сярод рабочых завода. Праводзяцца гутаркі аб Сталінскай Канстытуцыі і выбарчым законе. Па ініцыятыве комсамольскай арганізацыі на заводзе шырока разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва. Рабочыя абавязаліся сустрэць дзень выбараў выкананнем вытворчага плана.

Працоўныя вылучылі Ніну Віктараўну Смаржко кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Яна дала слова працаваць так, як вучыць таварыш Сталін. Выбаршчыкі ўпэўнены, што іх кандыдат з часцю апраўдае давер'е народа.

Г. Майскі.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

У АБЛАСНЫМ КАМІТЭЦЕ КП(б)Б

Бюро абласнога камітэта КП(б)Б прыняла пастанову аб правядзенні 18 сакавіка 69-й гадавіны Парыжскай комуны, дня міжнароднай інтэрнацыянальнай салідарнасці працоўных усяго свету — МОПР'а.

Падрыхтоўка і правядзенне дня Парыжскай комуны, дня МОПР'а павінны праходзіць пад лозунгам стварэння мопраўскіх арганізацый і разгортвання іх работы па інтэрнацыянальнаму выхаванню працоўных, выкрыцця імперыялістычнага характару вайны, растлумачэння мірнай палітыкі Совецкага Саюза, умацавання яго абароннай магутнасці, узорнай падрыхтоўкі да правядзення выбараў дэпутатаў у Вярхоўны Совет СССР і Вярхоўны Совет БССР, узняцця класавай рэволюцыйнай пільнасці і выкрыцця ўсякіх ворагаў народа.

Гаркомам і райкомам КП(б)Б прапанавана правесці нарады прадстаўнікоў ЛКСМБ, газет і прафсаюзаў па пытанню разгортвання інтэрнацыянальнай выхаваўчай работы сярод працоўных. 18 сакавіка на ўсіх прадпрыемствах, ва ўстановах і ў вёсках—арганізаваць інтэрнацыянальныя вечары з дакладамі аб 69-й гадавіне Парыжскай комуны і задачах МОПР'а, стварыць куткі МОПР'а, выпусціць насценныя газеты, у бібліятэках арганізаваць выстаўкі інтэрнацыянальнай літаратуры.

Абласному аддзелу мастацтва сумесна з Домам народнай творчасці прапанавана забяспечыць абслугоўванне інтэрнацыянальных вечароў мастацкімі часткамі, выпрацаваць адпаведную праграму гэтых вечароў.

ВУЧОБУ КОМУНІСТАЎ ТРЭБА АРГАНІЗОУВАЦЬ

Комуністы граеўскай раённай партарганізацыі нястомна павышаюць свой палітычны ўзровень, узбройваюцца марксізмам-ленінізмам. Настольным падручнікам іх з'яўляецца „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)“.

Выкарыстоўваючы кожную свабодную гадзіну 53 члены партыі і 18 кандыдатаў самастойна вывучаюць гісторыю ВКП(б). Большасць з іх ужо закончыла вывучэнне 4-й і 5-й глаў „Кароткага курса гісторыі ВКП(б).“ Прыклад работы паказваюць тт. Сакалоўскі Л., Шастакоў, Бруеў і Ульянаў. Яны к адпаведным раздзелам падручніка вывучылі творы Леніна і Сталіна. Сістэматычна наведваюць лекцыі, якія чытаюцца ў раёне. Граеўскі раённы камітэт КП(б)Б справе авалодвання комуністамі навукай марксізма-ленінізма ўдзяляе вялікаю ўвагу.

Для вывучэння мясцовым беспартыйным актывам гісторыі ВКП(б) пры парткабінеце РК створаны 2 гурткі, у першым з якіх займаюцца 22 таварышы. На заняткі яны прыходзяць падрыхтаванымі, з канспектамі і прымаюць актыўны ўдзел у таварыскай дыскусіі па вывучаемых тэмах. Да такіх таварышаў адносяцца Клодзецкі Л.—інспектар райана, Маркусфельд — работнік сельсовета, Геда К.—настаўнік поўнай сярэдняй школы.

У другім гуртку навучаюцца 26 таварышаў. У гэтым гуртку закончылі вывучэнне другой главы. Прыклад работы паказваюць тт. Кучынскі Ф., Войтаніс, Байкоўскі.

Для слухачоў гуртка па першай і другой главах „Кароткага курса гісторыі ВКП(б)“ прачытаны лекцыі.

Кіруе гурткамі прапагандыст РК тав. Сіленкоў. Як недахоп у рабоце, трэба адзначыць адсутнасць наглядных дапаможнікаў—альбома карт для вывучэння гісторыі ВКП(б).

Партыйным кабінетам сістэматычна праводзяцца кансультацыі ў дапамогу самастойна вывучаючым гісторыю партыі.

Так арганізавана вучоба комуністаў і беспартыйнага актыва у Граеўскім раёне.

Іншы малюнак маем у валкавыскай раённай партыйнай арганізацыі. Тут большасць комуністаў, застанавіўшыся на другой і трэцяй главах падручніка гісторыі партыі, далей не ідуць. Загадчык аддзелам прапаганды і агітацыі РК КП(б)Б тав. Селіцкі на пытанне, як навучаюцца комуністы, адказвае:

— Праводзім рэгістрацыю, выяўляем хто на якіх главах застанавіўся, хто і як у далейшым жадае вучыцца. Тут-жа ён заўважае, што вызначэнне, хто к якому звяну павінен быць аднесены, яшчэ не закончана. Відавочна, тав. Селіцкі запамятаваў указанне ЦК ВКП(б) аб тым, што галоўнай формай заняткаў комуністаў павінна з'яўляцца самастойная індывідуальная вучоба.

У выніку гэтага ў Валкавыску ўкамплектаваны толькі гурток па вывучэнню гісторыі партыі, які ахаплівае 6 членаў партыі і 23 комсамольцы. Арганізацыя вывучэння гісторыі партыі мясцовым беспартыйным актывам і самастойная вучоба комуністаў яшчэ недаацэньваецца.

Тав. Селіцкі замест аказання дзелавой дапамогі комуністам у вучобе ўсё збіраецца праводзіць тэаратычныя канферэнцыі. А на пытанне, хто і як займаецца, мог назваць толькі аднаго тав. Койдзенка, які добра над сабой працуе.

Трэба наладзіць работу ў парткабінеце, штодзённа аказваць канкрэтную дапамогу самастойна вывучаючым гісторыю ВКП(б) і галоўнае-арганізаваць вучобу з комуністамі.

Крывянкоў,
інструктар аддзела прапаганды і агітацыі абкома КП(б)Б

ЗДЗІЎЛЯЮЧАЯ НЕПАВАРОТЛІВАСЦЬ

Да дня выбараў — 24 сакавіка — засталіся лічаныя дні. Пярвічная-ж партарганізацыя Горхарчпромгандля ў правядзенне выбарчай кампаніі яшчэ, як належыць, не ўключылася.

Агітацыйная работа на выбарчых участках праводзіцца недастаткова. Партарганізацыя не ведае састава агітатараў на ўчастках. У гуртках па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона заняткі праводзяцца не рэгулярна. Таварышы Крымскі і Кіслік, прымацаваныя да ўчасткаў, на іх бываюць рэдка. Яны апраўдваюцца нібы перагружанасцю сваёй асноўнай работай. Уся работа партарганізацыі на выбарчым участку абмежавалася толькі правядзеннем некалькіх гутарак. Сакратар партарганізацыі тав. Фундатар нічога не можа сказаць аб рабоце, правадзімай на ўчастках.

27 лютага на агульным партсходзе прынята пастанова аб стварэнні на ўчастках гурткоў па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі, выбарчага закона і пытанняў бягучай палітыкі. Але гэтае рашэнне яшчэ не выканана. Здзіўляючая бестурботнасць партарганізацыі Горхарчпромгандля павінна быць заўважана гарадскім камітэтам КП(б)Б.

П. Грышчанка.



Знадворны выгляд 53-га ўчастка, Пролетарскай выбарчай акругі.
(Фота Сапір).

Удзел настаўнікаў у выбарчай кампаніі

Настаўнікі нашай абласці актыўна працуюць на выбарчых участках членамі выбарчых камісій і агітатарамі.

У трох раёнах Беластоцкай абласці (Беластоцкім, Заблудаўскім і Монькаўскім, не лічачы горада Беластока) каля 750 настаўнікаў (90 процантаў усяго настаўніцкага калектыва) удзельнічаюць у выбарчай кампаніі. У Гарадоцкім, Заблудаўскім, Старасельскім і іншых сельсоветах усе настаўнікі працуюць па выбарах.

Лепшым агітатарам мястэчка Гарадок, Беластоцкага раёна, з'яўляецца настаўнік Юльян Іванавіч Філонік. Тав. Філонік вядзе рэгулярна гурток па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі сярод сялян. Заняткі гуртка праводзяцца тры разы ў тыдзень. 25 чалавек вывучылі падрабязна Сталінскую Канстытуцыю, Палажэнне аб выбарах і біяграфіі кандыдатаў. Адначасова тав. Філонік разгарнуў агітацыйную работу ў школе, сярод настаўнікаў, бацькоў і вучняў. Па выхадных днях у школе працуе палітгурток, які наведваюць многія бацькі.

У вёсцы Навасёлкі, Гарадоцкага сельсовета, актывіст — настаўнік тав. Храноўскі Уладзімір ведае ўсіх выбаршчыкаў вёскі, асабіста гутарыць з кожным, заходзіць на кватэры. Раз у тыдзень усе жыхары вёскі збіраюцца ў аднаго з сялян і там пад кіраўніцтвам настаўніка тав. Храноўскага вывучаюць Канстытуцыю і выбарчы закон.

Вучні дапамагаюць сваім настаўнікам у афармленні выбарчых участкаў, разгортваюць мастацкую самадзейнасць па абслугоўванню выбаршчыкаў.

Настаўнікі гор. Беластока адстаюць ад сваіх вясковых таварышаў. У Беластоку актыўна ўдзельнічаюць у выбарчай кампаніі ўсяго 120 настаўнікаў з агульнай колькасці 800 чалавек. Але і тут ёсць нямала добрых агітатараў. Таварышы Зандберг, Мадэр, Найберг, Віленскі і іншыя ўвесь свабодны час аддаюць рабоце на ўчастку. Яны гутараць з выбаршчыкамі, растлумачваюць ім цэлы рад пытанняў, дапамагаюць правераць спіскі. Яны-ж афармлялі 88 участак лозунгамі і партрэтамі.

У 35 гуртках агітатары-настаўнікі знаёмяць выбаршчыкаў з біяграфіямі кандыдатаў, праводзяць гутаркі і сходы выбаршчыкаў на ўчастках, арганізуюць вечары самадзейнасці.

Л. Рудзік.

Чырвоны куток для выбаршчыкаў

67 выбарчы ўчастак Цэнтральнай выбарчай акругі мае ў сваім распараджэнні адну нязручную прахадную комнату ў школе. Днём праз комнату ў час перапынку снуюць вучні, і належнага парадку на ўчастку няма.

Многа намаганняў прыклалі члены ўчастковай выбарчай камісіі, каб знайсці памяшканне і зрабіць чырвоны куток для выбаршчыкаў. Урэшце, знайшлі дзве комнаты ў доме № 28 па вуліцы Чапаева.

У абсталяванні і ўпрыгожанні чырвонага кутка прымалі ўдзел актывісты-выбаршчыкі тт. Бабель, Ліўшыц, Агурак і інш. Жанчыны зрабілі ўсё, што было ім магчыма.

10 сакавіка ў чырвоным кутку адбыліся заняткі аднаго гуртка. Лектар тав. Сарокін прачытаў лекцыю аб міжнародным становішчы. Выбаршчыкаў прышло многа. Лекцыя вельмі цікавая, слухаюць яе з вялікай увагай. Баючыся парушыць цішыню, усе сядзяць амаль нерухома. Пасля лекцыі слухачы задаюць пытанні. Іх многа, самых рознастайных, хвалюючых. Пытанні і адказы непрыкметна пераходзяць у таварыскую гутарку. Расходзяцца неахотна...

Агітатары тт. Пальцаў, Кручкоў, Віленскі два разы арганізавалі для выбаршчыкаў калектыўныя прагляды кіно-карціны «На граніцы» і спектакля «Любоў Яравая». Спектаклем і фільмам усе засталіся вельмі задаволены, а потым доўга абмяркоўвалі і дзяліліся ўражаннямі. Гэта мерапрыемства трэба было-б пераняць і многім іншым участкам.

У самыя бліжэйшыя дні работнікам 67-га выбарчага ўчастка неабходна расшырыць чырвоны куток выбаршчыка за лік маючыхся свабодных комнат у гэтым-жа доме, павялічыць бібліятэку, лепш упрыгожыць комнату, наладзіць выпуск насценнай газеты.

Н. Бражнікава.

Лепш наладзіць медыцынскае абслугоўванне працоўных

Тры дні праходзіла ў Беластоку І-я абласная нарада медыцынскіх работнікаў. Упершыню ва ўмовах вызваленай Заходняй Беларусі сабраліся ўрачы, загадчыкі бальніц і амбулаторый, начальнікі санстанцый, работнікі аддзелаў аховы здароўя. Нарада падвяла вынікі больш чым пяцімесячнай работы совецкіх органаў аховы здароўя і распрацавала канкрэтныя мерапрыемствы па паляпшэнню лячэбнай і прафілактычнай работы ў абласці.

На нарадзе былі заслуханы і абмеркаваны даклад загадчыка аблздрава тав. Лебедзева аб становішчы аховы здароўя ў абласці і чарговых задачах, даклад намесніка народнага камісара аховы здароўя БССР тав. Воднева аб рабоце сельскага ўрачэбнага ўчастка і даклад тав. Ліўшыца аб барацьбе з эпідэмічнымі захворваннямі. Акрамя гэтага, былі заслуханы навуковыя даклады: кандыдата медыцынскіх навук тав. Кантаровіча аб дапамозе пры родах, даклад прафесара Дворжыца аб метадах барацьбы з трахомай і даклад асістэнта Мінскай інфекцыйнай клінікі тав. Брайнінай аб барацьбе з менінгітам.

Дасягненні ў галіне аховы здароўя за пяць з паловай месяцаў совецкай улады ў нашай абласці велізарныя. Медыцына перастала быць здабыткам толькі маёмаснай вярхушкі грамадства, яна стала даступнай шырокім масам працоўных. Калі раней тысячы рабочых, сялян — батракоў і беднякоў — былі пазбаўлены магчымасці атрымаць медыцынскую дапамогу і вымушаны былі «лячыцца» у розных шаптух, знахараў і т. д., то зараз совецкая ўлада прадаставіла працоўным бясплатнае медыцынскае лячэнне.

За параўнаўча кароткі тэрмін сетка лячэбных і прафілактычных устаноў у нашай абласці павялічылася больш чым у два разы. Характэрным у гэтых адносінах было выступленне на нарадзе загадчыка Свіслацкай раённай бальніцы тав. Равіцкага.

— На працягу 20 год,—гаворыць ён,—польскія заправілы збіраліся пабудаваць у Свіслачы бальніцу, але за ўвесь гэты час справіліся ўстанавіць толькі дошку з надпісам: «Тут будзе бальніца на 50 ложкаў». Тое, што не пад сілу было панам, стала даступным нам. Пры совецкай уладзе мы адкрылі бальніцу на 60 ложкаў.

Лічбы росту медыцынскіх устаноў здзіўляючыя. На месцы 26 бальніц, што былі на 1 верасня 1939 года, зараз працуе 41 бальніца. Лік ложкаў у іх павялічыўся значна больш чым у два разы. У абласці было 54 амбулаторыі і паліклінікі, зараз іх 116. Уноў адкрыты два туберкулёзных дыспансеры і два туберкулёзных пункты, трахомны пункт і інш.

Ніякіх клопатаў не праяўляў былы польскі ўрад аб рожаніцах і дзецях. Было ўсяго толькі 6 жаночых і дзіцячых кансультацый. Зараз іх 19. Уноў адкрыта 8 ясляў, дом дзіцяці, 17 акушэрскіх пунктаў.

Непараўнальна вырас лік санітарна-прафілактычных устаноў. Уноў адкрыта 7 санітарных станцый, вялікая колькасць санітарных пунктаў.

Медыцынскіх устаноў, асабліва ў гарадах, зараз упаўне дастаткова. Задача заключаецца ў тым, каб наладзіць узорную работу гэтых устаноў па абслугоўванню працоўных. Аднак, у гэтых адносінах яшчэ вельмі многа недахопаў. Узяць хоцьбы пытанне з кадрамі. Совецкая ўлада поўнасцю ліквідавала беспрацоўе сярод медыцынскіх работнікаў. Наадварот, зараз не хапае не толькі ўрачоў, але і сярэдняга і нават малодшага медперсанала. Асабліва не хапае кваліфікаваных медработнікаў на вёсцы. Аблздраў намеціў паслаць для ўмацавання сельскіх урачэбных участкаў 30 урачоў з Беластока і 10 урачоў з Гродна. Але некаторыя ўрачы, відаць, не разумеюць задач паляпшэння справы аховы здароўя на вёсцы і яшчэ не выехалі на месцы.

На нарадзе выявілася, што ў радзе месц няправільна выкарыстоўваюцца кваліфікаваныя кадры. Часта бывае так, што аблздраў пасылае маладога работніка, а яго адпраўляюць назад, як непадыходзячага. Так, пасланым у Бельск двум дзіцячым медсёстрам, якія маюць спецыяльную адукацыю, былі створаны такія ўмовы, што яны вымушаны былі пайсці з кансультацыі. У бальніцах Беластока медыцынскія сёстры з 10-гадовым стажам займаюцца тым, што разносяць абеды. Іх з поспехам можна было-б скарыстаць для больш адказнай работы.

Асноўны недахоп у рабоце медыцынскіх устаноў, заключаецца ў тым, што канчаткова не зжыты яшчэ сярод асобных урачоў навовы капіталістычнага ладу—барскія адносіны да патрэб працоўных, а часам і шкурніцкія настроі. Медыцына ў былой Польшчы грунтавалася на прынцыпах «гандлярства», «прыбыткаў». Нават на абласной нарадзе былі няправільныя выступленні, у якіх гучэлі ноткі пагардлівых адносін да працоўных, праяўляліся настроі «гандлярства». Так, др. Гольдберг імкнуўся даказаць у сваім выступленні, што, моў, сяляне злоўжываюць бясплатным лячэннем і занадта ўжо турбуюць урачоў. Падобныя ноткі, гучэлі і ў іншых выступленнях. Так, доктар Магаліф настойліва патрабаваў, каб у «чыста медыцынскія справы» не ўмешваліся «пастаронняя», як мясцкомы, сельсоветы і т. д. Моў, сам урач ведае, ці трэба яму выехаць да хворага на месца, ці хворы сам прыедзе да яго.

Мы ўжо не гаворым аб тым, што многія выступаючыя занадта многа займаліся вылічэннямі, колькі часу ідзе ў іх на выезды да хворых, скардзіліся на тое, што ім прыходзіцца працаваць больш 6 гадзін у дзень і т. д. На жаль, падобныя выступленні не атрымалі належнага асуджэння нарады.

Многа гаварылі на нарадзе аб аптэках. Гандлярства ў аптэках яшчэ не выкарчавана. Выступаючыя прыводзілі прыклады, калі ў асобных аптэках за лякарствы патрабавалі сала, яйкі і т. д. Адзін з выступаючых гаварыў, што ў 3-яй аптэцы Беластока агідна адносяцца да выдачы лякарстваў. Ён змог атрымаць тэрміновае лякарства толькі на другі дзень, калі яно ўжо было непатрэбна.

Тав. Лапкоўскі гаварыў у сваім выступленні аб тым, што сярод урачоў не разгорнута крытыка і самакрытыка. Урачы слаба ўключаюцца ў грамадскую работу. У бальніцах не наладжана культмасавая работа. Толькі паміж двума бальніцамі (1-ай і 2-ой) заключан дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва.

Вялікую ўвагу ўдзяліла нарада пытанню работы сельскага ўрачэбнага ўчастка, які з'яўляецца асноўным, рашаючым звяном ва ўсёй лячэбна-прафілактычнай рабоце на вёсцы. Пасля даклада намесніка Наркома аховы здароўя БССР тав. Воднева былі заслуханы садаклады беластоцкага, гродненскага і свіслацкага сельскіх урачэбных участкаў. Сельскія ўрачэбныя ўчасткі да гэтага часу слаба разгарнулі сваю работу. Наша задача у бліжэйшы час зрабіць іх цэнтрамі лячэбнай і прафілактычнай работы на вёсцы.

Многія выступаючыя правільна крытыкавалі аблздраў за тое, што ён кіруе медыцынскімі ўстановамі і медработнікамі толькі інструкцыямі і зборам вестак.

— Мы атрымліваем столькі інструкцый, цыркуляраў і зводак для запаўнення,—гаворыць др. Рабінзон,—што ніяк не можам адказаць на іх. Палова рабочага дня ідзе на перапіску.

Трэба спадзявацца, што нарада з'явіцца паваротным пунктам у паляпшэнні лячэбнай і прафілактычнай работы ў нашай абласці.

Т. Лясовіч.

ЗА РУБЯЖОМ

Водгукі замежнага друку на падпісанне мірнага дагавора паміж СССР і Фінляндыяй

ГЕРМАНІЯ

Берлін, 14 сакавіка. (ТАСС). У цэнтры ўвагі раніпшіх газет — мірны дагавор паміж Савецкім Саюзам і Фінляндыяй. Газета «Фелькішэр беобахтэр» надрукавала поўны тэкст мірнага дагавора, карту Фінляндыі, на якой абазначана яе новая ўсходняя граніца, і перадавы артыкул, прысвечаны мірнаму дагавору. Яна змясціла таксама пераказ перадавога артыкула газеты «Правда» — «Мірны дагавор паміж СССР і Фінляндскай рэспублікай» і партрэты таварышаў Молатава і Жданава.

ІТАЛІЯ

Рым, 14 сакавіка. (ТАСС). Увесь італьянскі друк пад буйнымі загалоўкамі паведамляе аб заключэнні мірнага дагавора паміж СССР і Фінляндыяй. Газеты поўнасцю апублікавалі тэлеграму ТАСС з тэкстам дагавора і прыкладзенага да яго пратакола. Адначасова прэса прысвяціла гэтай падзеі падрабязныя артыкулы, у якіх падкрэсліваецца велізарны ваеннастратэгічны поспех СССР. У артыкулах адабраюцца паводзіны фінляндскага ўрада, які прыняў савецкія ўмовы.

Газета «Трыбуна» выражае задавальненне ліквідацыяй канфлікта.

Газета «Лаворо фашыста» адзначае ўзмацненне стратэгічных пазіцый СССР.

ЭСТОНІЯ

Талін, 14 сакавіка. (ТАСС). Эстонскія газеты публікуюць тэкст мірнага дагавора паміж Савецкім Саюзам і Фінляндыяй, перадавы артыкул «Правды» і іншыя матэрыялы. У газетах «Уус эсці», «Постымеес» і «Рахвалехт» змешчана карта Фінляндыі з указаннем новай дзяржаўнай граніцы. Газеты ўказваюць, што мірны дагавор, які заключан паміж СССР і Фінляндыяй, стварае мір ва ўсёй паўночнай Еўропе, што ён з'яўляецца сведчаннем міралюбівай палітыкі СССР.

БАЛГАРЫЯ.

Сафія, 14 сакавіка. (ТАСС). Цэнтральнае месца балгарскага друку займаюць водгукі на мірны дагавор паміж СССР і Фінляндыяй, які азначае новы доказ міралюбівай палітыкі СССР. Газеты змяшчаюць партрэты Сталіна і Молатава.

Усе газеты на першых старонках публікуюць поўны тэкст дагавора і пратакол да яго.

РУМЫНІЯ

Бухарэст, 14 сакавіка (ТАСС). Учарашнія вячэрнія і сёнешнія раніпшія газеты пад буйнымі загалоўкамі змяшчаюць тэкст мірнага дагавора паміж СССР і Фінляндыяй, а таксама каментарыі да яго.

Усе газеты змяшчаюць партрэты таварышаў Сталіна і Молатава. Газета «Тэмналус» піша: «З самага пачатку Савецкі Саюз сцвярджаў, што ён не праследуе мэты падняволення Фінляндыі. Заключаны дагавор даказвае, што гэта было праўдай».

КІТАЙ.

Шанхай, 14 сакавіка. (ТАСС). Усе мясцовыя кітайскія газеты аднадушна вітаюць падпісанне мірнага дагавора паміж СССР і Фінляндыяй. Адабраючы лінію СССР у фінскім пытанні, як сведчанні міралюбнасці СССР, газеты падкрэсліваюць, што савецкі ўрад атрымаў новую бліскучую перамогу. Газета «Шэнчжоужыбао» у перадавым артыкуле піша: «Заключэннем мірнага дагавора з Фінляндыяй СССР ушчэнт разбіў планы падпальшчыкаў вайны і даказаў сваю вернасць палітыцы міру».

Газета «Данейжыбао» у перадавым артыкуле заяўляе: «Неабходна адзначыць, што СССР, не гледзячы на велізарную магутнасць сваёй арміі, гатоў на перагаворы з Фінляндыяй і патрабаваў ад яе толькі таго, што неабходна для забеспячэння бяспаснасці яго граніц. СССР не меў і не мае намеру парушаць незалежнасць Фінляндыі».

ДА ПРАДСТАЯЧЫХ ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА Ў ЗША

Нью-Йорк, 14 сакавіка. (ТАСС). Унутрыпалітычныя інтарэсы ЗША сканцэнтрываваны галоўным чынам на прадстаячых прэзідэнцкіх выбарах. Дэмакратычная партыя чакае заявы Рузвельта — ці намеран ён выставіць сваю кандыдатуру на пост прэзідэнта ў трэці раз. Мяркуюць, што Рузвельт можа дабіцца вылучэння сваёй кандыдатуры ад дэмакратычнай партыі, калі ён гэтага захоча. Пакуль што адзіным дэмакратам партыі, які адкрыта заявіў, што ён намеран дабівацца вылучэння сваёй кандыдатуры на пост прэзідэнта, з'яўляецца цяперашні віцэ-прэзідэнт Гарнер.

Гарнеру зараз 71 год, аднак, не гледзячы на гэтыя дастаткова старыя годы, ён праяўляе вялікую актыўнасць. Гарнер — буйны землеўласнік, яры рэакцыянер. Пазіцыя Гарнера ў пытаннях знешняй палітыкі мала вядома, бо за апошнія некалькі год ён ухіляўся ад заяў па буйных палітычных пытаннях.

Як мяркуюць, сур'ёзным прэтэндэнтам на пост прэзідэнта ад дэмакратычнай партыі з'яўляецца сенатар-дэмакрат Уйлер (ад штата Мантана). Аднак ён да гэтага часу не зрабіў ніякай заявы аб сваіх намерах. Пры прэзідэнце Гардынгу Уйлер заваяваў сабе рэпутацыю ліберала, бо ён садзейнічаў у выкрыцці праслаўтай аферы з раздаджай урадавых нафтавых участкаў, у чым былі замешаны высокапастаўленыя ўрадавыя асобы. Як паведамляе друк, Уйлер цесна звязан з кампаніяй меднай прамысловасці «Анаконда», якая фактычна кантралюе ўсю эканоміку штата Мантана. Адначасова Уйлер падтрымлівае сувязі з важнейшымі амерыканскімі прафсаюзнымі кругамі. У галіне знешняй палітыкі Уйлер, як і многія іншыя прэтэндэнты на пост прэзідэнта, выказваецца за захаванне нейтралітэта і супроць уцягнення ЗША ў вайну.

Сярод другіх дэмакратаў, якіх часта называюць магчымымі кандыдатамі на пост прэзідэнта, фігуруюць Хэл, Фарлі, міністр земляробства Уолес, генеральны пракурор Джэксон, былы губернатар Філіпінскіх астравоў Макнат. Ні адзін з гэтых магчымых кандыдатаў, напэўна, не абвясціць аб сваіх намерах да таго часу, пакуль Рузвельт не паведаміць, ці будзе ён дабівацца выбрання прэзідэнтам у трэці раз. Маўчанне Рузвельта стварае таксама цяжкасці і для рэспубліканцаў, якім прадстаіць вылучыць свайго кандыдата на з'езд у Філадэльфіі 24 чэрвеня. З'езд дэмакратычнай партыі, на якім будзе вылучана кандыдатура ў прэзідэнты, адбудзецца ў Чыкага 15 ліпеня.

Унутры рэспубліканскай партыі барацьба за вылучэнне кандыдата на пост прэзідэнта вастрэй, чым у дэмакратычнай партыі.

Цяпер ужо не менш чатырох прэтэндэнтаў на пост прэзідэнта вядуць актыўную кампанію, дабіваючыся падтрымання сваёй кандыдатуры, сярод іх пракурор Нью-Йорка Дзьюі, сенатар Вандэнберг, сенатар Тафт, выдавец Ганнет.

Дзьюі ніколі не займаў буйных пастоў і захоўвае поўнае маўчанне па ўсіх важнейшых палітычных пытаннях. Ён стварыў сабе рэпутацыю выключна дзякуючы барацьбе з бандытамі ў Нью-Йорку.

Вандэнберг рэзка выступаў супроць сацыяльнага заканадаўства. Пазіцыя Вандэнберга ў пытанні знешняй палітыкі ўвогуле характарызуецца як пазіцыя ізаляцыянісцкая.

Сенатар Тафт, сын былога прэзідэнта, вядом як ізаляцыяніст, таксама займае рэзка рэакцыйную пазіцыю ў пытаннях унутранай палітыкі, выказваецца супроць сацыяльных рэформ.

Ганнет (рэспубліканец), былы прэзідэнт Гувер, сенатар - рэспубліканец Брыджэс і іншыя таксама калі-небудзь упамінаюцца, як магчымыя прэтэндэнты на пост прэзідэнта ад рэспубліканскай партыі. Усе яны з'яўляюцца крайнімі рэакцыянерамі.

У адрозненне ад рэакцыйнай пазіцыі кіруючых кругоў рэспубліканскай партыі пазіцыя радавых членаў партыі іншая. «Амерыканскі інстытут грамадскай думкі» правёў апытанне сярод выбаршчыкаў - рэспубліканцаў, якія належаць да розных слаёў насельніцтва, ці лічаць яны неабходным вылучыць больш прагрэсіўную праграму, чым тая, якой прытрымлівалася рэспубліканская партыя на мінулых прэзідэнцкіх выбарах. 59 проц. апытаных адказалі сцвярджальна.

Усеамерыканская арганізацыя беспрацоўных («Рабочы альянс») выказалася за стварэнне трэцяй партыі. Кангрэс вытворчых прафсаюзаў, беспартыйная рабочая ліга і іншыя масавыя арганізацыі, якія ўсё больш крытычна адносяцца да палітыкі Рузвельта, да гэтага часу не паведамілі, якую пазіцыю яны зоймуць у час выбараў.

Апрача выбараў прэзідэнта і віцэ-прэзідэнта, 5 лістапада павінны адбыцца выбары палаты, прадстаўнікоў і адной трэцяй састава сената. Лідэры рэспубліканскай партыі прызнаюць, што яны не змогуць атрымаць большасць ў сенаце, аднак яны ўпэўнены атрымаць большасць у палаце прадстаўнікоў.

ВАЙНА НА МОРЫ

Берлін, 14 сакавіка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе:

«Звярнуўшыся з рэйда, камандзір падводнай лодкі Шугарт рапартаваў аб патапленні непрыяцельскіх суднаў агульным вадазмяшчэннем у 24.600 тон.

Лондан, 14 сакавіка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, на запрос нарвежскай асацыяцыі ўладальнікаў суднаў Германія адказала, што германскаму марскому і паветранаму флоту прыказана прымаць самыя рашучыя меры супроць суднаў нейтральных краін, калі яны ідуць пад непрыяцельскім канвоем, не маюць звычайных агнёў ці нацыянальных апазнавальных знакаў, прыменяюць свае радыёперадачы для паведамлення ваенных звестак і не астанаўліваюцца па сігналу. Нейтральныя суды, якія ідуць у караване, не пад непрыяцельскім канвоем, павінны захоўваць сугубую асцярожнасць, асабліва ў месцах дзеяння ваенных караблёў».



Мнагалюдна ў вясеннія дні на вуліцах Беластока. (Фота Сапір).

КІНО

„ПАДКІДЫШ"

Гэта новая савецкая кінокамедыя. Галенавіта задуманая, своеасаблівa пастаўленая, майстэрска сыграная, — яна гучыць радаснай песняй нашаму шчасліваму і прыгожаму жыццю. Выдатныя знаўцы дзіцячай душы — пісьменніца - ордэнаносца А. Барто і артыстка Рына Зялёная напісалі цікавейшы, змястоўны сцэнарый. І на працягу ўсяго фільма ў гледача не сходзіць усмешка з вуснаў, то выклікаючы гучнае захапленне, то ціхае замілаванне. Багацце жыццёвых фарбаў і бадзёрая энергія здароўя, апраўданага аптымізма трымаюць нас прыкованымі да экрана.

Гэта камедыя нікога не высмейвае і ні над чым не іранізіруе. Няма ў ёй таміх «адмоўных» фактаў. Глядач смяецца проста ад радасці і харастава бачанага.

Бо падумаць-жа: у Маскве згубілася з дому пяцігадовая дзяўчынка. Проста, ціхенька, вышла яна з кватэры на вуліцу пагуляць. Брацік Юра, чкому мамі, ідучы на работу, наказвала сачыць за Наташай, забавіўся з таварышамі, што прышлі да яго па гарадскіх піянерскіх справах. А калі ён успомніў пра сястрычку, дома яе не аказалася. І як забаўна бачыць дзіця, што сур'ёзнасць, з якой прыняцелі прусіліся на пошукі. А «вучоны сабачка» праходзіць праз рад кадраў, як пацешны элемент агульнай вясёлай гармоніі.

Тымчасам дапытлівая і смелая дзяўчынка хутка знайшла чым забавіцца на вуліцы, — на маскоўскай, прасторнай, кіпучай і прыгожай вуліцы. Перад намі праходзяць кавалкі рознастайнага харастава Масквы. Так маленькая Наташа забрыла ў дзіцячы сад, а потым трапіла ў кватэру старога халасцяка геолага. Адсюль зноў забаўнейшыя гісторыі. Халасцяк гатоў ужо нікуды больш не пускаць яе, палічыўшы, што яе проста падкінулі, а ён прытуліць яе. Так-бы яно і было, калі-б Наташа сапраўды была падкінута роднымі.

Толькі-ж маленькая вандроўніца зноў знайшла прычыны выйсці і з гэтай кватэры гасцінага дзядзькі, зноў акунулася ў вір людскога руху, і новыя прывіды захапілі яе. Колькі такту, ведання, дзіцячай псіхікі, нораваў, мяккасці і юмару патрабна было мець сцэнарыстам і рэжысёру Тацьяне Лукашэвіч, каб так роўна, захапленна, змястоўна правесці ўсе кадры фільма, цікавага і дзецям, карысная і дарослым.

Потым — дзяўчынку шукаюць ужо ў некалькіх месцах. Юра мабілізаваў сваіх равеснікаў, геолаг таксама адправіўся на пошукі, а яна ўжо бяскопатна ішла па вуліцы Горкага, сустрэтая і прыласканая незнаёмымі супругамі. Але яны таксама згубілі дзіцятку - дзяўчынку і смуткуюць, а глядач смяецца, бо Наташа не прападзе, яна ўжо трапіла ў новыя рукі, хоць таксама чужыя, але яшчэ больш прывтныя.

Справа дайшла да ўсеагульных пошукаў і роспытаў і калі пры дапамозе міліцыі Наташу знайшлі і яна апынулася на руках у мамы, яна, стомленая багата перажытым днём, засынаючы, кажа:

— Мама, а што калі-б нам з табой яшчэ раз разам заблудзіцца?..

Ёй прыемна было заблудзіцца. Яе ніхто не пакрыўдзіў, не адпіхнуў, а кожны, хто сустракаў і думаў, што яна пакінутая бацькамі, прыгалубліваў і шанаваў яе, маленькага савецкага чалавека. І яна не баялася заблудзіцца. Вось такая наша савецкая рэчаіснасць.

Гэты фільм гучыць паэмай нашай рэчаіснасці, песняй нашаму шчасцю, мілагучна складзенай выдатнымі знаўцамі дзіцячай душы — А. Барто і Рынай Зялёнай.

І. Клінаў.

ШКОЛЬНАЕ ПАМЯШКАННЕ ЗАНЯЛІ ПАД СКЛАД

У школу ФЗУ гор. Гродна многа вучняў прыбыла з вёскі. Размясцілі іх па кутках, па два на адзін ложак, што вельмі перашкаджае нармальнай вучобе. Райспажыўсаюз заняў частку школьнага памяшкання пад склад, у той час, калі тут меркавалася абсталяваць інтэрнат і сталовую для вучняў. Загады дырэкцыі і прафкома аб звароце школьнага памяшкання не прыводзяць да патрэбных вынікаў.

Віленчык і Рубінчык,
члены прафкома школы ФЗУ.

САМАЛЁТ «СССР Н-211» у БУХЦЕ КАЖЭЎНІКАВА

Бухта Кажэўнікава, 12 сакавіка. (Спецкор ТАСС). На аэрадроме бухты Кажэўнікава зрабіў пасадку першы за зімовую навігацыю самалёт «СССР Н-211», пілатуемы палярным лётчыкам тав. Махоткіным. На барту самалёта прыбыло 7 пасажыраў і дастаўлена тры тоны грузаў.

У зваротны рэйс самалётам на Вялікую зямлю вылятае 20 палярнікаў Нордвігбуда.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА
гарадскога выканаўчага камітэта гор. Беластока

ад 13 сакавіка г. Беласток

Абавязаць усіх домаўласнікаў, упраўдамамі, камендантаў інтэрнатаў, дырэктараў прадпрыемстваў, фабрык, заводаў, школ і інш. неадкладна ачысціць прыбіральні, выграбныя і памыйныя ямы і вывезці ўсе нечыстоты і смецце ў адведзеныя для гэтага месцы не пазней 25 сакавіка.

Абавязаць усіх упраўдамамі, камендантаў інтэрнатаў, дырэктараў прадпрыемстваў, фабрык, заводаў, школ і прыватных домаўласнікаў зрабіць не пазней 15 красавіка рамонт і правядзенне ў спраўнае становішча прыбіральняў, выграбных ям і смеццевых скрынак, а таксама зрабіць новыя, дзе іх няма. Усе скрынкі павінны быць забяспечаны крышкамі; прыбіральні і скрынкі — знадворку пабелены.

Абавязаць усіх пералічаных у п. 1-м гэтай пастановы асоб прыступіць да штодзённай дэзінфекцыі (20 процантным растворам вапны) усіх прыбіральняў, выграбных і памыйных ям, смеццевых скрынак і вытвараць рэгулярную іх ачыстку не радзей аднаго разу ў шасцідзёнку.

Абавязаць усіх указаных у п. 1-м гэтай пастановы асоб да 15 красавіка г. г. ачысціць і адрамантаваць усе шахтныя (укапныя) студні, забяспечыць іх крышкамі і прымацаванымі вёдрамі. Акружаючую студню тэрыторыю утрамбаваць глінай ці замасціць.

Асобы, віноўныя ў нарушэнні данай пастановы, будуць падвяргацца адміністратыўнаму спагнанню — штрафу да 100 рублёў ці прымусовым работам да 14 дзён.

Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскласці на органы РК Міліцыі і Дзяржсанінспекцыю.

Гэта абавязковая пастанова ўваходзіць у сілу з дня яе апублікавання.

Старшыня гарадскога выканаўчага камітэта гор. Беластока **ГАРЭЛІК**

Адказны сакратар гарадскога выканаўчага камітэта гор. Беластока **ОКУНЬ**

ПАСТАНОВА
АБЛАСНОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА

13 сакавіка 1940 г. г. Беласток.

У сувязі з правядзеннем выдачай пашпартаў, Беластоцкі аблвыканком пастанаўляе:

1. **З 16 па 22-е сакавіка 1940 года зрабіць перарэгістрацыю ўсіх грамадзян-бежанцаў, пражываючых на тэрыторыі Беластоцкай вобласці, незалежна ад іх сацыяльнага паходжання, нацыянальнасці і працоўнага упрадкавання.**

2. Перарэгістрацыю бежанцаў у горадзе Беластоку ўскласці на гарадскі камітэт па ўпарадкаванню бежанцаў.

3. Перарэгістрацыю бежанцаў ва ўсіх астатніх гарадах, мястэчках і іншых населеных пунктах ускласці на раённыя выканаўчыя камітэты і гарадскія саветы.

4. Прапанаваць усім кіраўнікам устаноў і прадпрыемстваў зрабіць перарэгістрацыю ў паказаных вышэй пунктах усіх бежанцаў, у розны час прынятых на работу.

5. Абавязаць усіх кіраўнікоў прадпрыемстваў і устаноў не прымаць на работу бежанцаў, якія не прайшлі перарэгістрацыю, а камітэты па ўпарадкаванню бежанцаў—не залічаць такіх на бясплатнае харчаванне, не прадастаўляць ім інтэрнату і не вызначаць на месца жыхарства.

6. Усім бежанцам пры перарэгістрацыі выдаць стандартныя даведкі для атрымання пашпарту.

7. Абавязаць Беластоцкі камітэт па упарадкаванню бежанцаў і раённыя выканаўчыя камітэты штодзённа паведамляць аблвыканкому аб ходзе перарэгістрацыі.

8. Усе даныя ўчоту па вобласці сканцэнтраваць у абласным выканаўчым камітэце.

9. Даручыць органам міліцыі прасачыць за выкананнем гэтай пастановы.

Старшыня Беластоцкага аблвыканкома **Мальцаў.**
Сакратар **Егораў.**

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Упаўнаважаны абліта № 346.

1-я дзяржаўная друкарня у г. Беластоку.